

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 12 (167) 23 КРАСАВІКА 1991 ГОДА

*Агульны клопат*

## КАБ НЕ ЗАЙСЦІ Ў ТУПІК

15 красавіка адбылася сустрэча студэнтаў ВНУ і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў вобласці з кіраўнікамі партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных абласных органаў. У сустрэчы прынялі ўдзел першы сакратар Гродзенскага абкама КПБ У. М. Сямёнаў, старшыня абласнога Савета народных дэпутатаў Д. К. Арцыменя, старшыня абласнога Савета прафсаюзаў В. А. Кобрын, першы сакратар абласнога камітэта камсамола С. Пацэвіч, старшыня Гродзенскага гарадскога выканкамаС. Н. Домаш, першы сакратар Гродзенскага гаркама КПБ Г. А. Забродскі.

Народны дэпутат СССР, першы сакратар Гродзенскага абкама КПБ У. М. Сямёнаў расказаў аб цяжкім, вельмі складаным палітычным і сацыяльна-эканамічным становішчы ў рэспубліцы. Слухачы мелі магчымасць з першых рук атрымаць інфармацыю аб Пленуме ЦК КПБ, які адбыўся ў суботу, 24 красавіка, у Мінску.

«Сёння,— адзначыў прамоўца,— як ніколі патрэбны ўзаемаразуменне, аб´ектыўнасць, своечасовасць прыняцця і выканання неабходных мер. Перабудова ў сучасным выглядзе завяла наша грамадства ў тупік. Не адбылося ні абнаўлення партыі, ні абнаўлення грамадства. Тэрмінова патрабуюцца радыкальныя меры па аздараўленню эканомікі. Рэформа будзе буксаваць да той пары, пакуль мы не вызначым , якое грамадства мы хочам мець. Калі будуць прапанаваны новыя сацыяльна-эканамічныя структуры, пры якіх людзі будуць жыць лепш,— гэта будзе добра». Уладзімір Міхайлавіч параўнаў сённяшнюю сітуацыю ў нашай краіне са становішчам у 1923 годзе. «Сёння, як і тады, выпадковасць, неабдуманасць, бессістэмнасць рашэнняў у вобласці эканомікі ставіць краіну перад эканамічным крызісам». Ён лічыць, што не было неабходнасці ў новым саюзным дагаворы. Лепшага дакумента, чым дагавор 20-х гадоў пакуль што няма. Цяжкасці ўзнікалі таму, што было вельмі шмат парушэнняў гэтага дагавора. Трэба канчаткова вызначыць паўнамоцтвы цэнтра, рэспублік. «Цэнтральнае кіраўніцтва,— сказаў першы сакратар,— пайшло за папулісцкімі патрабаваннямі аб суверэнітэце ўсіх і ўся. Гэты суверэнітэт прызнае верхавенства толькі асабістых рашэнняў, а з-за гэтага парушаюцца палітычныя і эканамічныя сувязі. І таму сёння многія дэпутаты проста не ведаюць, што ім адказваць на пытанні і патрабаванні выбаршчыкаў. Як вынік новага суверэнітэту — пагроза невыканання ўсіх дагавароў і дэкларацый. Было шмат абяцанняў. Для выканання ўсіх пунктаў з праграм дэпутатаў трэба каля шасці трыльёнаў рублёў, а нацыянальны даход у краіне складае каля 700 мільярдаў. На сацыяльныя патрэбы штогод аддавалася з бюджэту 10,6 млрд. рублёў. На 1991 год запланавана 47,9 млрд. рублёў, гэта пры тым, што нацыянальны даход знізіцца на 15 працэнтаў.

У той час, калі ў Мінску праходзіў Пленум ЦК КПБ, засядаў стачачны камітэт. На гэтым пасяджэнні прысутнічалі прадстаўнікі Украінскага руху, Саюдзіса, Міжнароднага валютнага фонду, Дэмакратычнай Расіі, ліберальна-дэмакратычнай партыі, кіраўнікі рабочага саюза і БНФ. На пасяджэнні выказвалася думка не прызнаваць ні аднаго рашэння саюзных органаў, калі нават яны задавальняюць патрабаванні бастуючых. Выказваліся патрабаванні аб дэпалітызацыі, дэпартызацыі грамадства, але гэта,— як заўважыў Уладзімір Міхайлавіч,— супярэчыць міжнароднай Хартыі па правах чалавека, якая была падпісана ў Парыжы ў 1990 годзе».

У. М. Сямёнаў расказаў пра абстаноўку ў вобласці. «Усе паказчыкі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, транспарце ў вобласці выкананы. Напрыклад, тавараў народнага спажывання выраблена на 10,8 млрд. рублёў, гэта на 576 млн. рублёў больш, чым было запланавана. У вобласці існуе праграма «Жыллё». Згодна з ёй, у 1997 годзе атрымліваць кватэры павінны былі ўжо тыя, хто стаў бы на чаргу ў 1994 годзе. І гэта праграма была б выканана, калі б не землетрасенне ў Арменіі і не аварыя на Чарнобыльскай АЭС. 25 працэнтаў сродкаў ідзе на аказанне дапамогі гэтым рэгіёнам.

Ёсць шмат цяжкасцяў. Сёння прадпрыемствы стаяць перад пагрозай закрыцця. Падарваны гаспадарчыя сувязі, заключэнне гаспадарчых дагавароў паміж рэспублікамі пакуль што не дало нічога канкрэтнага».

Першы сакратар абласнога камітэта КПБ расказаў пра становішча ў абласной партыйнай арганізацыі. «Шмат былых членаў КПСС пакінулі партыю, будуць страты яшчэ, але партыйная арганізацыя вобласці вярнулася да рашэння сацыяльна-эканамічных пытанняў. Ёсць свая праграма дзеянняў і трэба толькі, каб яна не засталася на паперы».

Уладзімір Міхайлавіч адказаў на пытанні прысутных у зале.

— Вашы адносіны да М. С. Гарбачова?

— Лічу, што як Генеральны сакратар ЦК КПСС ужо тры гады не займаецца партыйнай работай. Я член ЦК і кажу гэта адказна. Думаю, што ў яго проста няма фізічных сіл быць Генеральным сакратаром.

— Ці плануецца ў Гродна будаўніцтва студэнцкага гарадка?

— Плануецца пабудаваць такі гарадок для універсітэта. Але яшчэ не падрыхтавана ўся дакументацыя, бо не вызначаны сродкі для фінансавання.

— Ці будуць уведзены льготы студэнтам для праезду ў міжгародніх аўтобусах?

— У будучым наогул усе льготы будуць адменены. Вы ж галасавалі за пераход да рынку і павінны былі ведаць, што не будзе ніякіх скідак.

На пытанні адказаў таксама і старшыня абласнога Савета народных дэпутатаў.

— Які сярэднестатычны кошт абедаў у студэнцкіх сталовых?

— Кошт абедаў не павінен перавышаць 2 руб. 30 кап. Калі кошт будзе павялічвацца, то мы пойдзем на кампенсацыю расходаў.

— Якія льготы маюць сямейныя студэнты?

— Думаю, што можна зрабіць так, каб прадаваць тавары гэтай групе студэнтаў пад заказ.

— Скажыце, ці можна замест талонаў на харчаванне, якія зараз выданы студэнтам, атрымліваць грошы?

— Калі вы ў сваёй установе палічыце, што гэта вам неабходна, то гэта можна зрабіць.

— У абласным Савеце разглядалася праграма «Моладзь», але яна ўжо даўно знаходзіцца толькі на ўзроўні камісіі.

— Праграма будзе разглядацца ў першым паўгоддзі. Мы павінны вызначыць, якія заганы першачарговыя, а якія — другасныя. Гэта даволі складаная справа, якая звязана з фінансамі.

«Калі не будзе канфрантацыі, калі жыццё будзе праходзіць у спакойным, дзелавым рытме, то абласны Савет зможа выканаць свае абяцанні, сваю праграму,— сказаў на заканчэнне Дзмітрый Канстанцінавіч.— Савет гатовы падтрымаць усіх, хто збіраецца паляпшаць наша жыццё».

**С. Лаўнік.**

## НА СХОДЗЕ КАМУНІСТАЎ УНІВЕРСІТЭТА

11 красавіка адбыўся агульнауніверсітэцкі партыйны сход. На ім былі разгледжаны пытанні аб 121-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, інфармацыя кантрольнай камісіі аб выкананні камуністамі факультэта правазнаўства Статута КПСС, аб уплаце членскіх узносаў, арганізацыйнае пытанне.

У дакладзе члена парткама, прафесара Жарскага М. В., з якім ён выступіў па першаму пытанню, уздымаліся такія актуальныя праблемы, як адносіны да ленінскай спадчыны, да Леніна, значэнне марксізма-ленінізма ў наш час. «Тэарэтычная спадчына У. І. Леніна дае поўнае права сцвярджаць, што ленінізм — гэта вяршыня тэарэтычнай думкі канца XIX — пачатку XX ст.,— сказаў дакладчык.— З цягам часу яна ўваходзіць у фундамент культуры і становіцца праграмай дзейнасці на будучае. Тэорыя У. І. Леніна — гэта глыбокая метадалогія аналізу грамадскіх рэальнасцей, палітычная стратэгія рэвалюцыйнай дзейнасці. У гэтым каштоўнасць і сіла дактрыны Леніна, сакрэт здольнасці яе мабілізаваць масы на рэвалюцыйныя пераўтварэнні і дасягнуць перамогі. Аднак,— зазначалася ў дакладзе,— не ўсім гэта па душы, не ўсім з Ленінам па дарозе. У грамадстве ёсць сілы, якія гатовы на ўсё, каб вытравіць імя і вобраз Леніна з народнай памяці».

«Вось таму,— сказаў дакладчык,— неабходна, каб кожны супрацоўнік універсітэта, кожны студэнт у першую чаргу валодалі праўдзівай інфармацыяй пра Леніна, змаглі супрацьпаставіць аргументаваны адказ.

Неабходна так арганізаваць партыйную работу ва універсітэце і на факультэтах, каб вывучэнне ленінскай спадчыны арганічна звязвалася з паўсядзённай практыкай жыцця, дапамагала пошукам выйсця з крызіснага становішча, узбройвала студэнтаў і выкладчыкаў ленінскай метадалогіяй пазнання рэчаіснасці».

Сход зацвердзіў адпаведныя мерапрыемствы.

Па другому пытанню выступіў старшыня кантрольнай камісіі парткама Сенько В. В. Ён праінфармаваў аб парушэннях з боку асобных камуністаў партыйнай арганізацыі факультэта правазнаўства Статута КПСС, аб уплаце членскіх узносаў. Прынята пастанова: тэрмінова пагасіць запазычанасць, абавязаць сакратароў партбюро факультэтаў строга кантраляваць уплату камуністамі членскіх узносаў.

На сходзе разгледжана заява сакратара парткама універсітэта Пчэльніка У. К. аб датэрміновым складанні паўнамоцтваў.

Сакратаром парткама абраны Ярмусік Эдмунд Станіслававіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі БССР.

**Парткам.**

## ПАЗЫЎНЫЯ СУБОТНІКА

Узнікнуўшы ў час, калі маладая Савецкая Рэспубліка перажывала адзін са складанейшых перыядаў грамадзянскай вайны, камуністычныя суботнікі з´явіліся новай хваляй працоўнага энтузіязму рабочага класа. У. І. Ленін убачыў у суботніках вышэйшую арганізацыю працы, парасткі новага, камуністычнага грамадства. «Коммунистические субботники именно потому имеют громадное историческое значение, что они показывают нам сознательный и добровольный почин рабочих в развитии производительности труда, в переходе к новой трудовой дисциплине, в творчесвте социалистичеких условий хозяйства и жизни».

Не парушана традыцыя камуністычных суботнікаў і цяпер, у наш складаны час. Наш універсітэт, як і ў мінулыя гады, горача падтрымаў ідэю правядзення ленінскага суботніка, прысвечанага 121-гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Быў створаны штаб суботніка, які ўзначаліў старшыня прафкама выкладчыкаў і супрацоўнікаў У. А. Хілюта. Штабу было даручана распрацаваць план правядзення работ. І вось на працоўныя аб´екты выходзяць выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты.

На сённяшні дзень сіламі студэнтаў філфака ўжо прыбрана тэрыторыя вучэбнага корпуса № 1 (вул. Ажэшкі, 22), выкладчыкі філалагічнага і матэматычнага факультэтаў абавязаліся прыбраць унутраны двор галоўнага корпуса, рыхтуецца да здачы металалом.

Суботнік у нас будзе праводзіцца некалькі дзён, на розных факультэтах у свае дні. За гэты час плануецца навесці парадак на тэрыторыях інтэрнатаў № 2 і 3 (як унутры памяшканняў, так і на вуліцы). Запланавана ўборка калідораў, файе, будуць вымыты вокны у вучэбных корпусах універсітэта. Студэнты гістарычнага, юрыдычнага, матэматычнага, біялагічнага факультэтаў выйдуць на ўборку гарадскіх вуліц (вул. Даватара і зав. Даватара). Гісторыкі правядуць свой суботнік за працай і на ваенных могілках, што на вул. Белуша.

Нашы студэнты будуць задзейнічаны і на гарадской будоўлі. Студэнты (у асноўным 1—2 курсаў) ўсіх факультэтаў будуць цэлы тыдзень, аж да 26 красавіка, працаваць на будоўлі школы на вул. Ліможа, а таксама на будоўлі будынку прамбудбанка.

Так як гэта вельмі цяжкая работа, тут будуць задзейнічаны толькі хлопцы. Усе зробленыя грошы будуць пералічаны на рахунак Фонду сацыяльнай абароненасці студэнтаў.

Штаб суботніка запрашае ўсіх прыняць актыўны ўдзел у працоўных акцыях. Усе работы на замацаваных аб´ектах неабходна завершыць не пазней 27 красавіка.

Чакаем вашай інфармацыі аб удзеле ў суботніку на тэл. **44-50-54 (прафкам), 44-72-97 (рэдакцыя шматтыражнай газеты «Гродзенскі універсітэт».**

# ГАСПАДЫНЬКА

## ВЯРНІЦЕ« МАЛАДОСЦЬ» УПРЫГОЖВАННЯМ



Амаль у кожнай жанчыны ёсць шкатулачка з любімымі ўпрыгожваннямі. Але час робіць сваё, упрыгожванні могуць «пастарэць», асабліва, калі не даглядаць за імі. Бывае так, што забытае ўпрыгожванне раптам акажацца вельмі неабходным да самай прыгожай і моднай сукенкі, і ўсе ахнуць ад захаплення. А як любяць дочкі і ўнучкі разглядаць бабуліны і матуліны шкатулкі, знаходзячы там столькі радасці! Пастарайцеся даглядаць за сваімі «скарбамі», прыслухайцеся да нашых парад.

Каб упрыгожванні з металу не пакідалі след на адзенні, трэба памаляваць іх са зваротнага боку лакам для ногцяў.

Залатыя пярсцёнак і завушніцы заблішчаць яшчэ больш, калі патрымаць іх у пасалоджанай вадзе.

Для таго, каб вымыць залатыя ўпрыгожванні, трэба пакласці іх у мыльную ваду і асцярожна пацерці мяккай зубной шчоткай, асабліва тыя месцы, дзе яны зашпіляюцца.

Гладкі залаты пярсцёнак добра цысціць губной памадай.

Ланцужок мыюць у бутэльцы, трошкі патрасаючы, пакуль бруд не сыйдзе, затым выціраюць насуха ручніком.

Пыл з пярсёнкаў дастаюць запалкам з накручанай на яго ваткай, якая змочана адэкалонам, гліцэрынам або сумессю магнезіі з нашатырным спіртам, затым выціраюць абрэзкам замшы ці фланелі.

Сярэбраныя пярсцёнкі, брошкі, ланцужкі можна чысціць сухой суконнай анучкай або мяккай шчоткай, змочанай у цёплай мыльнай вадзе. Можна выкарыстаць для гэтага і зубны парашок.

Сярэбраныя прадметы аднаўляюць свой бляск, калі апусціць іх на 2—3 гадзіны ў ваду, у якую пакладзена нарэзаная бульба, а потым спаласнуць вадой.

Упрыгожванні са шкла мыюць у растворы сціральнага парашку, потым у чыстай вадзе і выціраюць насуха мяккім чыстым ручніком.

Буйныя пацеркі мыюць шчоткай. Пацеркі, нанізаныя на рызінку або нітку, лепш мыць без мыла.

Пластмасавыя бранзалеты, брошкі, завушніцы, пярсцёнкі мыюць у чыстай вадзе, без мыла. Калі пацеркі вельмі забрудзіліся, іх трэба рассыпаць, прамыць, высушыць і зной нанізаць.

Упрыгожванні з янтара і слановай косці можна мыць у цеплай мыльнай вадзе. Калі слановая косць пажаўцела, або пакрылася плямкамі, трэба пакласці выраб на 10 хвілін у слабы раствор хлорнай вапны, потым асцярожна пацерці анучкай.

Жэмчуг — сапраўдны і штучны — трэба берагчы ад драпін і захоўваць яго асобна ад іншых упрыгожванняў, завернутым у мяккую тканіну. Зрэдку рэкамендуецца праціраць аксаміткай.

Пацеркі з сапраўднага жэмчуга трэба кожны год перанізваць.

Медныя ўпрыгожванні чысцяць сумяссю мыла і нашатырнага спірту. Калі яны не вельмі забруджаныя, то іх дастаткова пацерці сухой ватай.

*А я раблю так...*

## МУХАМОР СА СМАКАМ ПАМІДОРА

Святочны стол звычайна запамінаецца мноствам або незвычайнасцю прыгатаваных страў, сервіроўкай. Але не меншую памяць ён пакіне пра сябе, калі будзе накрыты з выдумкай, фантазіяй.

Паглядзіце на малюнкі: колькі вясёлых упрыгожванняў можна зрабіць з агародніны і садавіны для святочных страў. Вараная бульба, морква, буракі, яйкі, яблыкі, зялёная цыбуля — адным словам, усё, нават яблычныя зярняткі вам спатрэбяцца.

Вазьміце, напрыклад, вараную бульбіну або яйка, накрыйце іх паловай румянага яблычка або памідора, зрабіце на ім сметанковым маслам белыя кропелькі —і вось на талерцы ўжо стаіць мухамор у траве з зялёнай цыбулі.

А снежны чалавечак і Пятрушка нарадзіліся з двух бульбін, надзелі шапачкі з морквы, расплюшчылі вочкі з яблычных зярнятак. Гузікі, устаўленыя ў дзірачкі, можна зрабіць з журавінаў, валасы і венікі — з галінак пятрушкі.

З морквы зроблены мышка і жыраф, толькі ў мышкі галава з яйка, а вушкі з абрыкосавых або слівавых костачак.

Для кветак вараны бурак і моркву трэба разрэзаць, як паказана на малюнку. Зялёная цыбуля пятрушкі ператворыцца ў сцяблінкі і лісточкі. Прыгожы матылёк атрымаецца з яйка: бялок — вялікія крыльцы, жаўток — маленькія. Палова чырвонага яблыка з галоўкай з чарнасліву вельмі падобна да божай кароўкі, а чорныя кропачкі можна зрабіць з яблычных зярнятак.



## ГАСПАДЫНЯ, АЛЕ НЕ АФІЦЫЯНТКА

***У любое свята самая клапатлівая роля — у гаспадыні. Яна і гатуе, і падае, і прыбірае. І запамінаецца яно ёй толькі стомленасцю, якая валіць з ног. Ці ёсць у гэтай сітуацыі магчымасць хоць трошкі зняць нагрузку з гаспадыні? Так, ёсць. Мабыць мала хто не чуў выказванне «шведскі стол». Нешта падобнае можна выкарыстаць і пры сустрэчы гасцей на свята. Асабліва, калі ў вас невялікая кватэра, у якой, як кажуць, павярнуцца няма дзе. Робіцца гэта наступным чынам.***

***Стол накрываецца белым ці святочным каляровым абрусам. На левы край ставяць адна на адну закусачныя талеркі і чаркі. Каля іх размяшчаюць нажы, відэльцы, кладуць сурвэткі. На стол ставяць халодныя закускі, каля кожнай талеркі кладуць адпаведны прыбор, якім накладваюць страву. Напіткі лепш за ўсё трымаць на асобным століку. Шведскі стол — гэта стол самаабслугоўвання. Канкрэтнага месца ні ў кога няма. Кожны госць кладзе сабе на талерку тое, што яму падабаецца. Гаспадыня толькі сочыць, каб на стале не было пустых талерак і бруднага посуду, каб стол выглядаў прыгожым увесь вечар.***

***Я прапаную паспрабаваць накрыць такі стол. Улічваючы, што ён сервіруецца ў асноўным халоднымі закускамі, салатамі, да спадобы там прыйдуцца і розныя бутэрброды, рэцэпты якіх вам і прапаную.***

***Вельмі смачныя і эфектыўныя бутэрброды з мяса або з рыбы. Адварыце мяса або рыбу, надайце ім форму і памер лустачак хлеба, пакладзіце на хлеб, упрыгожце зверху кружочкамі варанай морквы, зялёнымі галінкамі пятрушкі, заліце жэле і пастаўце на холад. Жэле гатуецца так: у гарачы рыбны або мясны булён пакладзіце размочаны ў халоднай вадзе жэлацін і размяшайце яго да поўнага растварэння. Затым дабаўце трошкі морквы, пастаўце каструлю на слабы агонь.***

***Бутэрброды з зялёным маслам. Старанна размяшайце размякчанае сметанковае масла з нарэзанай пятрушкай, пакуль не атрымаецца аднародная маса, дабаўце па густу гарчыцы або хрэну і намажце гэтай сумессю лустачкі хлеба. Зверху пакладзіце на хлеб кавалачак адваранай курыцы або свініны і пасыпце чорным перцам.***

***Бутэрброды з рыбным паштэтам. Вазьміце 200 г салёнай рыбы (лепш за ўсё маленькай), добра прамыйце халоднай вадой, працадзіце, прапусціце два разы праз мясарубку, або разатрыце відэльцам, дабаўце дзве галоўкі нацёртай на тарцы цыбулі, трошкі хлеба, намочанага ў вадзе або малацэ, 1/3 стакана алею або сметанковага масла, сок лімона, чайную лыжку цукру і два крутыя жаўткі і атрыманым паштэтам упрыгожце лустачкі хлеба. Вашы госці ні за што не здагадаюцца, з якога «дэфіцытнага» прадукта прыгатаваны гэтыя смачныя бутэрброды.***

***Смачна есці!***

РУБРЫКУ ВЯДЗЕ Г. КАМЕНЕВА.

## *ПЕРШЫЯ ВЯСНОВЫЯ ГРЫБЫ — НЕБЯСПЕЧНЫЯ*

*Вельмі каштоўным дарам прыроды, адным з цудаў расліннага свету па праву называюць грыбы. Здаўна чалавек адносіў іх да самых каштоўных харчовых прадуктаў з-за іх выключнай пажыўнай каштоўнасці, цудоўных смакавых якасцяў і водару. Нездарма называюць грыбы лясной гароднінай, лясным хлебам. Гэта не перабольшванне. Грыбы шырока выкарыстоўваюцца ў харчовым рацыёне чалавека ў розным выглядзе: вараным, салёным, сушаным або марынаваным. Аднак, на жаль, далёка не ўсе ведаюць, якія грыбы з ´яўляюцца прыдатнымі да яды, а якія — ядавітымі.*

*Атручванне грыбамі магчыма не толькі пры ўжыванні ў страву непрыдатных да яды грыбоў, але і прыдатных пры няправільнай іх апрацоўцы і кансерваванні.*

*Вясной, у канцы красавіка, калі ў бярозы пачынаюць распускацца маладыя лісткі, на палянах, высечках, былых пажарышчах з ´яўляюцца першыя вясновыя грыбы — смачныя, хоць і непрыгожыя, смаржкі і страчкі. Іх з ´яўленне грыбнікі заўсёды сустракаюць с асаблівай радасцю. З гэтых першых свежых грыбоў можна прыгатаваць вельмі смачныя, пажыўныя стравы ў той час, калі ніякіх іншых грыбоў яшчэ няма. Але трэба заўсёды быць вельмі асцярожнымі. Гэтыя грыбы хаваюць у сабе ядавітыя рэчывы, якімі можна атруціцца.*

*Па сваіх смакавых якасцях смаржкі і страчкі ні ў чым не ўступаюць лепшым прадстаўнікам грыбнога царства. Неабходна толькі памятаць: атручванне магчыма толькі пры ўжыванні неабясшкоджаных грыбоў.*

*Якія ж сімптомы атручвання вясновымі грыбамі? Звычайна, дзеянне яду праяўляецца не адразу, а праз 6—10 гадзін. Спачатку з ´яўляецца пачуццё паўнаты і здаўлення ў вобласці страўніка, якое пераходзіць у боль і рэзі. Потым узнікае моташнасць, якая пераходзіць у неспрыяльную рвоту. Хутка наступае агульная слабасць і разбітасць. Вельмі часта атручванне суправаджаецца рэзкім галаўным болем, зацямненнем свядомасці, трызненнем, сутаргамі, нярэдка назіраецца жаўцізна скураных покрываў і слізістых абалонак, часта далучаецца панос. Частата і паслядоўнасць прыведзеных вышэй прыкмет атручвання залежыць ад цяжкасці захворвання, што ў сваю чаргу звязана з колькасцю з ´едзеных грыбоў, станам здароўя пацярпеўшага. Асабліва хутка яд дзейнічае на арганізм дзяцей, людзей маладога ўзросту, цяжарных жанчын і старых. Яд можа трапіць да грудного дзіцяці з малаком маці, якая з ´ела атручаны грыб. Пры лёгкім атручванні і своечасовым лячэнні на 5—13 дзень наступае выздараўленне. У цяжкіх выпадках смерць наступае пры падзенні сардэчнай дзейнасці на 3—4 дзень атручвання.*

*Асноўнай прычынай атручвання з ´яўляецца няведанне правілаў перапрацоўкі смаржкоў. Перад прыгатаваннем стравы са смаржкоў, іх неабходна абавязкова адварыць двойчы па 15—20 хвілін (для знішчэння ядагельвелавай кіслаты), старанна прамываючы пасля кожнага адварвання чыстай гарачай вадой. І толькі пасля гэтага грыбы сановяцца прыдатнымі для смажання, тушэння або марынавання.*

*У страчках знаходзіцца яд (гірамітрын), які не знішчаецца нават пры кіпячэнні. Гэты яд добра разбураецца пры працяглым (5—6 месяцаў) высушванні. Сушыць грыбы трэба ў дзень збору ў добра праветрываемых месцах, але не пад прамымі промнямі сонца. Дасушыць можна і на сонцы. Перад прыгатаваннем сушаныя грыбы трэба замачыць для набракання на 3—4 гадзіны, нарэзаць, прамыць, зліць вару. Адварыць грыбы да змякчэння ў падсоленай вадзе, адвар выліць, не смакуючы. Прамытыя і аджатыя грыбы падвяргаюць паўторнай тэрмічнай апрацоўцы, пасля чаго іх можна выкарыстоўваць для салатаў, жарыць, варыць.*

*Ва ўсіх выпадках атручвання грыбамі трэба абавязкова звярнуцца за медыцынскай дапамогай, таму што дапамагчы можа толькі радыкальнае лячэнне ва ўмовах стацыянара. Да прыходу ўрача хвораму трэба прамыць страўнік слабым растворам марганцавакіслага калія, з дапамогай клізм апаражніць кішэчнік, забяспечыць строгі пасцельны рэжым — рух хворага паскарае ўсмоктванне яду. Для больш хуткага вывядзення яду і папярэджання абязводжвання арганізма, трэба паіць хворага як мага часцей халоднай падсоленай вадой, моцным чаем, малаком або кавай. Рэшткі грыбной стравы трэба захаваць для лабараторнага даследавання, якое неабходна для дыягностыкі атручвання.*

*Калі вы не будзеце звяртаць увагі на вышэй прыведзеныя парады, небяспека атручвання смаржкамі і страчкамі вельмі вялікая.*

**В. ПРАКАПОВІЧ,**
**старшы выкладчык кафедры асноў медыцынскіх ведаў і аховы здароўя дзяцей, кандыдат медыцынскіх навук.**


Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Аб ´ём газеты— адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 16.00.
Т.2000

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПАРТКАМ, ПРАФКАМ
СТУДЭНТАЎ,
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

С. М. ЛАЎНІК